# «КАБ ААН БЫЛА БОЛЬШ ЭФЕКТЫЎНАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам Пастаяннага прадстаўніка Рэспублікі Беларусь пры ААН Валянціна Рыбакова. Як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, сустрэча актуальная і тым, што на пачатку ліпеня на палях саміту ШАС адбылася яго сустрэча з Антоніу Гутэрышам, генеральным сакратаром ААН.**

«Адбылася такая цікавая размова, цікавая сустрэча, інтэрпрэтавалі яе па-рознаму розныя сродкі масавай інфармацыі, асабліва ў інтэрнэце, накшталт таго, што прэтэнзіі нейкія Гутэрыуш прад'явіў нам», — нагадаў ён. Але, як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, ніякіх прэтэнзій не было: «Наадварот, мы атрымалі станоўчую ацэнку. Але што нам іх ацэнка, мы бачым, што там адбываецца на месцы твайго знаходжання. Мы зараз ацэньваем адпаведным чынам «дэмакратыю» сусветную і гегемона нашага, і іншае. Але гэта іх пытанні».

Прэзідэнт заявіў, што Беларусь як адна з краін-заснавальніц падтрымлівала і будзе падтрымліваць Арганізацыю Аб'яднаных Нацый. Ён прызнаў, што ёсць пэўныя недахопы ў дзейнасці ААН. Але, па словах беларускага лідара, яны тычацца не генеральнага сакратара ААН ці ўсёй арганізацыі ў цэлым. Гэта недахопы ўсіх яе членаў, бо кожны мае свой голас, сваё меркаванне. «Мы гэта цудоўна разумеем. Але будзем працаваць над тым, каб Арганізацыя Аб'яднаных Нацый была больш эфектыўнай арганізацыяй, каб своечасова прымаліся рашэнні, і каб гэтыя рашэнні былі справядлівымі для ўсіх краін пераважнай большасці. Хаця б для краін — удзельніц Арганізацыі Аб'яднаных нацый, а не так, як гэта адбываецца цяпер, дзякуючы той палітыцы, якую праводзіць Захад, перш за ўсё ЗША, карыстаючыся сваёй дамінуючай перавагай у эканоміцы, фінансах і гэтак далей. Таму мы за Арганізацыю Аб'яднаных Нацый, мы будзем падтрымліваць усе талковыя ініцыятывы, якія будуць адпавядаць нашаму разуменню справядлівага светаўладкавання — шматпалярнасці ў свеце і гэтак далей. У гэтым напрамку будзем дзейнічаць. І нашы людскія ініцыятывы ні ў якім разе не набываюць меншую значнасць для сусветнай супольнасці, наадварот, значныя. Мы таксама будзем прытрымлівацца іх і іншых пытанняў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Беларускі лідар пацікавіўся ў Валянціна Рыбакова поглядам на сітуацыю ў ЗША, сітуацыяй у ААН. Ён запытаў, якія намаганні варта прыкласці, каб голас Беларусі ў ААН быў больш значным.

У сваю чаргу Валянцін Рыбакоў падкрэсліў, што пры ўсёй вялікай значнасці ўдзелу Беларусі ва ўсіх інтэграцыйных структурах на розных міжнародных пляцоўках, ААН з'яўляецца адзінай універсальнай міжнароднай арганізацыяй, дзе прадстаўлены ўсе дзяржавы свету. «Для нас гэта вялізная магчымасць, якой мы актыўна карыстаемся, каб данесці нашу пазіцыю, каб голас Беларусі быў чутны па ўсіх пытаннях, якія ўяўляюць прыярытэтную цікавасць для нас», — сказаў ён.

## ❍ У тэму

### У ААН мы працуем з усімі краінамі

У размове з журналістамі Валянцін Рыбакоў падкрэсліў значнасць ААН у якасці ўніверсальнай міжнароднай арганізацыі, дзе прадстаўлены ўсе дзяржавы свету. «Гэта дае нам магчымасць працаваць фактычна з усімі краінамі, спрабаваць данесці нашу пазіцыю па прыярытэтных для Беларусі пытаннях», — сказаў ён. Пастаянны прадстаўнік Беларусі ў ААН расказаў, што зараз шмат часу надаецца рабоце, накіраванай на супрацьдзеянне незаконным аднабаковым санкцыям. «Пры гэтым трэба дакладна разумець, што мы не можам і не зможам ніколі і не павінны патрабаваць ад ААН зняць санкцыі. Гэта не аанаўскія санкцыі. Яны таму і называюцца аднабаковымі прымусовымі мерамі. Гэта меры, якія прыняты або канкрэтнай дзяржавай, або групай дзяржаў. Гэта не міжнародныя санкцыі», — растлумачыў ён. Валянцін Рыбакоў дадаў, што санкцыі называюць незаконнымі, паколькі яны груба парушаюць міжнароднае права, Статут ААН, усе магчымыя правы чалавека. «Законнымі санкцыямі з'яўляюцца толькі тыя, якія прыняты па рашэнні Савета Бяспекі ААН. Кропка. Усе астатнія санкцыі з'яўляюцца незаконнымі», — растлумачыў дыпламат. У сувязі з гэтым сэнс работы ў ААН па антысанкцыйнай тэматыцы заключаецца ў тым, каб даводзіць да міжнароднай супольнасці найцяжэйшыя наступствы ўвядзення такіх санкцый. Прычым часта гэтыя наступствы аказваюцца найбольш адчувальнымі не столькі для Беларусі, колькі для іншых дзяржаў. Асабліва, калі санкцыі тычацца экспарту калійных угнаенняў і з улікам маштабаў недаядання і голаду на планеце, у першую чаргу ў краінах Глабальнага Поўдня. Валянцін Рыбакоў падкрэсліў, што маштаб і наступствы гэтых забарон адчуваюцца ўсюды, і гэта разумеюць партнёры з заходніх дзяржаў.

Таксама беларускія дыпламаты на палях ААН прасоўваюць пытанні, звязаныя з подзвігам савецкага і беларускага народаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, праціздзеяннем спробам гераізацыі нацызму і праявам неанацызму, абаронай традыцыйных сямейных каштоўнасцяў. Гэта таксама дасягненне на нацыянальным узроўні Мэт устойлівага развіцця.»Нам тут ёсць чым ганарыцца, нам ёсць што расказваць міжнароднай грамадскасці. Мы дзелімся вопытам, гаворым аб сваіх дасягненнях. Прызнаём, што асобныя мэты не выконваюцца. У першую чаргу гэта звязана з наступствамі санкцыйнага націску», — адзначыў Валянцін Рыбакоў. Ён падкрэсліў, што ў пастпрадстаўніцтве Беларусі наладжаны цудоўныя дзелавыя і асабістыя адносіны з кіраўніцтвам і персаналам пастаянных прадстаўніцтваў многіх дзяржаў. Падтрымліваюцца кантакты і з дыпламатамі з краін Захаду, у тым ліку з краінай знаходжання — ЗША. «Не абавязкова гэты дыялог носіць адкрыты характар, але ён нікуды не падзеўся і ніколі не спыняўся», — запэўніў дыпламат.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «УСЕ ПРАБЛЕМЫ, АСАБЛІВА ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА, ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗНЯТЫ»

**Раніцай 18 ліпеня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклад старшыні Гомельскага аблвыканкама Івана Крупко аб устараненні ў рэгіёне наступстваў урагану, паведамляе БЕЛТА.**

Іван Крупко падрабязна далажыў Прэзідэнту аб ходзе аднаўленчых работ у вобласці і сітуацыі на раніцу чацвярга ў цэлым.

Кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача да раніцы пятніцы завяршыць усе работы па падключэнні насельніцтва да электрасілкавання, у тым ліку ў самых аддаленых населеных пунктах.

«Да раніцы ўсе праблемы, асабліва для насельніцтва, павінны быць зняты», — так гучала даручэнне Прэзідэнта.

Міністэрству энергетыкі і старшыням аблвыканкамаў пастаўлена задача па рэвізіі ўсіх энергетычных магутнасцяў і электрасетак, а таксама наяўнасці ліній рэзервовага сілкавання. У выпадку выяўлення хоць якіх-небудзь невялікіх фактараў, што выклікаюць насцярожанасць, старыя сеткі павінны быць дэманціраваны і заменены, каб пазбегнуць у будучым такіх сітуацый. Гэта яшчэ адно даручэнне Аляксандра Лукашэнкі.

Другі блок даручэнняў датычыўся ўстаранення наступстваў стыхіі ў лясным масіве.

# УРАДЖАЙ НА ПОЛІ. ЯГО ТРЭБА САБРАЦЬ БЕЗ СТРАТ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Фота БелТА.

Пры гэтым, паводле яго слоў, умовы надвор'я ўносяць карэктывы ў працу, часам не дазваляючы атрымліваць неабходную прадукцыйнасць. «Аграрыі гатовыя да ўсіх змен прыродных фактараў. Стаіць задача — максімальна выкарыстоўваць наяўную тэхніку, штодня забяспечваць не менш за 5 % уборкі збожжавых каласавых, рапсу», — дадаў начальнік Галоўнага ўпраўлення раслінаводства Мінсельгасхарча.

Так, на раніцу чацвярга (18 ліпеня) убрана ўжо больш за 21 % збожжавых каласавых і намалочана амаль 1,5 мільёна тон збожжа. Убрана больш за 70 % азімага рапсу і намалочана амаль 700 тысяч тон масляного насення дадзенай культуры. «Гэтыя лічбы вышэй за паказчыкі аналагічнага перыяду мінулага года. На палях ураджай ёсць. Спадзяемся, што запланаваныя аб'ёмы будуць атрыманыя», — заключыў Мікалай Лешык.

Высокую гатоўнасць тэхнічнай базы ўборачнай кампаніі адзначыў **начальнік Галоўнага ўпраўлення тэхнічнага прагрэсу і энергетыкі, дзяржаўнага нагляду за тэхнічным станам машын і абсталявання Станіслаў КАРПОВІЧ.** Ён заявіў, што ва ўборачнай кампаніі задзейнічана больш за 120 тысяч адзінак тэхнікі, у тым ліку 7,4 тысячы уборачных камбайнаў, больш за 8 тысяч машын для адвозкі збожжа і каля дзвюх тысяч збожжаўборачных комплексаў для дапрацоўкі збожжа. «Адначасова будзе весціся падрыхтоўка машын, якія будуць удзельнічаць у апрацоўцы глебы і восеньскай сяўбе. Гатоўнасць тэхнікі высокая. Забяспечанасць запчасткамі дастатковая для таго, каб падтрымліваць машынна-трактарны парк у тэхнічна спраўным стане. Машыны забяспечаны ўсімі сродкамі пажаратушэння. Усе арганізацыйныя пытанні кантралююцца. Сумесна з органамі дзяржаўнага кіравання, у тым ліку з Міністэрствам прамысловасці і камітэтамі па сельскай гаспадарцы, заводамі — вытворцамі сельгастэхнікі, на рэгулярнай аснове праводзяцца аператыўныя нарады, што дазваляе падтрымліваць тэхніку ў працаздольным стане», — падсумаваў Станіслаў Карповіч.

## Наша тэхніка дазваляе падымаць і палегліцу

Пасля непагадзі ў выхадныя дні, якая нанесла значны ўрон сельскай гаспадарцы ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, аграрыі аднавілі ўборачную кампанію. Прыродныя анамаліі, зарэгістраваныя ў краіне, сталі прычынай значных пашкоджанняў збожжавых пасеваў, пасеваў рапсу і кармавых культур, у першую чаргу кукурузы. Сур'ёзны ўрон нанесены пасевам лёну. Агульная сітуацыя па краіне ацэненая ў 27, 5 тысячы гектараў пашкоджаных плошчаў.

Аднак Мікалай Лешык падкрэсліў, што праца па ацэнцы наступстваў стыхіі працягваецца і ёсць падставы меркаваць (гледзячы на магутныя ліўні ў чацвер), што гэты паказчык зменіцца. Найбольшая колькасць пацярпелых плошчаў была падлічана на поўдні краіны і яе цэнтральнай частцы: звыш васьмі тысяч гектараў пасеваў пашкоджана ў Гомельскай вобласці, больш за 7 тысяч гектар і 6 тысяч гектараў у Брэсцкай і Мінскай абласцях адпаведна. Разам з тым ураджай на асобных участках спецыялісты спадзяюцца выратаваць.

Зараз працягваецца праца камісіі па ацэнцы нанесеных страт, спецыялісты вызначаюць далейшы лёс пасеваў. Калі збожжавыя пашкоджаны, але не знішчаны канчаткова, ураджай са стратамі і ніжэйшай якасцю, але будзе ўбраны, паколькі тэхніка дазваляе падымаць і палегліцу. Сустракаюцца, на жаль, і ўчасткі, дзе каласы выратаваць не атрымаецца, — такія пасевы будуць спісаныя. Палі тут падрыхтуюць да сяўбы наступных сельскагаспадарчых раслін. Што тычыцца кармавых культур, участкі з гушчынёй, якая перавышае 50 % ад першапачаткова высеяных аб'ёмаў, будуць прыбраныя. Лёс іншых вырашаць эксперты: плошчы альбо засеюць прамежкавымі кармавымі раслінамі, альбо падрыхтуюць пад сяўбу азімых ураджаю 2025 года.

Пацярпелыя пасевы не адзіная праблема для аграрыяў. Многія сельскагаспадарчыя аб'екты — фермы, збожжатокі і сушылкі — засталіся без электраэнергіі, што не дазваляе весці актыўную ўборку пераўвільготненых участкаў, бо збожжа з іх неабходна прасушваць. Гэта адбілася на тэмпах уборачных работ, знізіўшы іх на парадак. Важна, акрамя таго, забяспечыць падачу электраэнергіі на жывёлагадоўчыя аб'екты, бо без электрычнасці складана забяспечыць рэгулярнае кармленне і даенне буйной рагатай жывёлы.

Сыравіны для хлеба і макаронных вырабаў у краіне, паводле ацэнак Мінсельгасхарча, павінна хапіць. Для гэтых патрэб на прадпрыемствы перапрацоўкі пастаўляюць 13—15 % сабранага збожжа каласавых.

«Мы ў любым выпадку разумеем, што гэта першачарговая задача. І мільён збожжа будзе пастаўлена ў бягучым годзе на перапрацоўчыя прадпрыемствы. Гэта значыць харчовая бяспека краіны будзе забяспечаная», — адзначыў Мікалай Лешык.

Паводле папярэдніх разлікаў, ураджаю будзе дастаткова, каб забяспечыць і кармамі жывёлагадоўлю. «Якія не былі б падзеі апошніх дзён, у нас яшчэ ёсць пасевы кукурузы, і яны таксама даволі ў добрым стане», — падкрэсліў прадстаўнік міністэрства.

## Праводзяцца комплексныя меры па зніжэнні пажараў

Традыцыйна ў летняй кампаніі адно з асноўных пытанняў, якому надаюць самую сур'ёзную ўвагу — гэта падрыхтоўчы этап да ўборачнай. Такім меркаваннем падзяліўся **начальнік Галоўнага ўпраўлення нагляду і прафілактыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь Дзмітрый ТУРЧЫН.**

«Каля шасці з паловай тысяч аб'ектаў намі ўжо абследавана, выдадзены адпаведныя прыняўнасці парушэнняў рэкамендацыі і прадпісанні па іх ліквідацыі. Вядома ж, усе гэтыя рэйды праводзяцца сумесна, у тым ліку і з органамі ўнутраных спраў, са сродкамі масавай інфармацыі, з органамі ўлады, з тэхнічнымі інспекцыямі. Яны абыходзяцца, вядома ж, не без парушальнікаў. З улікам права адміністрацыйнага заканадаўства, мы ў тым ліку вызваляем ад адказнасці з вынясеннем афіцыйнага папярэджання, але ёсць асобы, да якіх, на жаль, з першага разу не заўсёды атрымліваецца дастукацца. У гэтым выпадку яны прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці. Такіх у цяперашні час 126 кіраўнікоў і іншых службовых асоб», — распавёў Дзмітрый Турчын.

Асноўная прычына ўзгаранняў гэтай тэхнікі — няспраўнасць у эксплуатацыі электраабсталявання і знос механізмаў. Пажары ўзнікаюць у выніку курэння на працоўным месцы, бескантрольных зварачных работ, а яшчэ таму, што часам гэтая дарагая тэхніка ў вёсках строга не ахоўваецца.

«Прафілактычная работа, якая актыўна намі праводзіцца, дае вынік, што адлюстроўваецца на статыстыцы пажараў, у тым ліку і падчас уборачнай кампаніі, — падкрэсліў Дзмітрый Турчын. — Сёлета ад пажараў выратавана 2 будынкі, 8 адзінак тэхнікі, 8 тон збожжа, 68 тон саломы. У адносінах да мінулага года значна зніжаны аб'ёмы знішчанай або пашкоджанай сельскагаспадарчай маёмасці: па будынках і збудаваннях зніжэнне парадку 16 %, па колькасці грубых кармоў — 89 %, саломы — 87 %, па колькасці пасеваў збожжавых — зніжэнне на 100 %. У 53 % выпадкаў вядучую ролю ва ўзнікненні пажараў адыгрывае чалавечы фактар, калі на вытворчасці не выконваецца тэхналагічны рэгламент».

Таксама Дзмітрый Турчын распавёў, што традыцыйна супрацоўнікі МНС аказваюць актыўную дапамогу ва ўборцы ўраджаю — на розных работах задзейнічана каля 418 чалавек з гэтага ведамства.

**Сяргей КУКАЧ.**